# ДЗВЕ ДАТЫ

Дзень лістапада: той, далёкі
І тэты, сённяшні — дзве даты.
Тады над Гомелем аблокі
Страсалі гулкія гарматы.
Прастору сённяшняга неба
Птушыныя хістаюць крылы,
Сняжынкі падаюць на глебу,
А не асколкі сталі стылай.
Той лістапад студзіў руіны,
Слаў пахаванкі гамяльчанкам,
ён горкім быў, як сок рабіны,
І новым радаваў світанкам,
А тэты — ў электраззянні,
А тэты — з песняй, звонкім смехам.
А тэты ладзіць рыштаваі і,
Узводзіць новыя паверхі.
Дзве даты. Дата вызвалення
І гэта, сённяшняя дата —
Мацнейшае перапляценне
Тугі і шчасця лістапада.
Той лістапад у нашых сэрцах,
Жыве перабудовай — гэты.
Мой горад — прыгажун
імкнецца
Да светлай запаветнай мэты.